КЛАКСАН

# У ПОШУКАХ БУДУЧЫНІ

## Галоўныя выклікі аўтамабільнага 2018 года

**Адыходзячы аўтагод стаў даволі насычаным як для Беларусі, так і для свету ў цэлым. Змяніліся пакаленні дзясяткаў як бюджэтных, так і прэміяльных мадэляў, умацаваліся пазіцыі недарагіх аўтамабіляў на рынку, што зноў паказала на нізкую плацежаздольнасць пакупнікоў. Вядома, запрацаваў доўгачаканы завод «БелДжы», з'явіўся вельмі цікавы беларускі красовер — увогуле, падзеямі год дакладна не абдзелены. Затое да 2018-га ёсць некалькі пытанняў, тры самыя важныя з якіх сфармуляваў журналіст «Звязды».**



Фота БЕЛТА.

### Што будзе з Geely?

Напэўна, гэта адно з галоўных пытанняў у аўтасферы Беларусі. Нагадаем, што ў лістападзе бягучага года адбылося ўрачыстае адкрыццё новага завода СЗАТ «БелДжы», у мерапрыемстве прыняў удзел і Аляксандр Лукашэнка. У 2018 годзе плануецца выйсці на новы ўзровень лакалізацыі дэталяў — калі зараз ён складае крыху больш за 31%, то налета павінен быць больш за 52%. Гэта значыць пярэдні і задні масты, колавыя дыскі, сістэмы ABS і ESP, а таксама сядзенні будуць беларускай зборкі, што з'яўляецца цалкам дасягальным паказчыкам, аднак далёка не самым істотным.

Плануецца, што ў 2018-м з канвеера сыдуць 25 тысяч аўтамабіляў — каля 22 тысяч пойдзе на Расію, астатнія некалькі тысяч — на продаж у Беларусі. У будучыні плануецца павялічыць магутнасці да 120 тысяч. Каб прадпрыемства было рэнтабельным, трэба прадаваць як мінімум 35 тысяч аўто за год. Больш за тое, завод будзе выпрацоўваць аўтамабілі Geely ў асноўным для расійскага рынку. І вось тут узнікае сур'ёзнае пытанне.

А наколькі рэальныя такія планы? Бо, як вядома, попыт нараджае прапанову. Паспрабуем адсачыць па той жа Расійскай Федэрацыі. У 2017 годзе самай папулярнай кітайскай маркай стаў Lifan. Па даных аналітычнага агенцтва «Аўтастат», за мінулыя 10 месяцаў гэтага года прадалі 13 094 аўто брэнда. Другое месца — Chery, кампанія рэалізавала 4692 аўтамабілі, адставанне ад лідара проста велізарнае. А вось на трэцім месцы — якраз Geely з паказчыкам у 1872 машыны.

Больш за тое, агенцтва адзначае, што продажы Geely ў Расіі ў параўнанні з 2016 годам упалі на 53,4%. Інакш кажучы, для поўнага выканання плана беларуска-кітайскай кампаніі трэба будзе прадаць 22 тысячы аўтамабіляў у Расійскай Федэрацыі, а гэта значыць — павялічыць цяперашні паказчык больш чым у 11 разоў. Сцвярджаецца, што ў прадпрыемства ёсць дакладная бізнес-стратэгія, якая дазволіць дамагчыся гэтага. Праз 12 месяцаў убачым.

### Як зменіцца беларускае заканадаўства?

Яшчэ з верасня 2017 года дэпутаты сталі абмяркоўваць магчымыя змены ў заканадаўстве ў аўтамабільнай сферы. Нагодай сталі скаргі людзей, якія сфармуляваны дастаткова выразна. Першае — ёсць аўтаўладальнікі, якія двойчы на год плацяць дарожны падатак пры праходжанні тэхагляду, напрыклад таксісты. Ёсць жа ўладальнікі новых машын, якія плацяць пошліну адзін раз на два гады, але адразу ў двухразовым памеры. Акрамя таго, усе плацяць аднолькава, нягледзячы на адлегласці, якія праязджае кіроўца. Прынцып несправядлівы.

Другая прэтэнзія заключаецца ў наступным: чалавек ездзіць на машыне, праходзіць тэхагляд і плаціць дзяржпошліну, а калі ён яе прадасць, то новы ўладальнік абавязаны будзе прайсці і выплаціць усё нанова, нават калі папярэдні зрабіў гэта за тыдзень да яго. Сутнасць у тым, што падатак прывязваецца да ўладальніка, а не да аўто.

Трагедыя каля сталічнага гандлёвага цэнтра, калі пад коламі грузавіка загінула дзіця, абвастрыла сітуацыю. Стала вядома, што той аўтамабіль ужо два гады як не праходзіў тэхагляд. Пазней з'явілася сур'ёзная лічба: амаль палова аўтамабіляў у Беларусі ездзіць без тэхагляду. Чаму? Танней заплаціць штраф, чым дзяржпошліну.

У 2018 годзе гэтае пытанне плануецца вырашыць канчаткова. Дэпутаты ўжо працуюць над праектам указа, згодна з якім дзяржпошліну могуць замяніць на транспартны збор з магчымасцю памесячнай аплаты. Чакаем.

### Электрычнасць рэальна заменіць паліва?

Новы 2018 год пакажа, наколькі жыццяздольная ідэя электрамабіляў. Чаму можна зрабіць такую выснову? Ёсць галоўная прычына — сталі прыходзіць трывожныя навіны пра кампанію Tesla.

Нагадаем, гэтая арганізацыя ў 2006 годзе прадставіла аўтамабіль Model S, які карэнным чынам змяніў уяўленне аб электрамабілях. Пакуль найбуйнейшыя аўтагіганты распрацоўвалі тэхналагічныя маторы і старанна скарачалі расход паліва, Tesla паказала аўтамабіль, які ў залежнасці ад камплектацыі і электрычнага сілавога агрэгата можа праехаць на адной зарадцы больш за 600 кіламетраў. Дзівосная лічба, таксама як і паказчык разгону да 100 кіламетраў за гадзіну. У максімальнай камплектацыі такі аўтамабіль можа пераадолець гэтую адзнаку за 2,7 секунды. Такім чынам звычайны электрычны седан стаў у адзін шэраг з суперкарамі. Неймаверна!

Пасля гэтага многія аўтамабільныя карпарацыі пачалі работу над уласнымі электрамабілямі — і сёння на рынку нават ёсць з чаго выбіраць. Але праблема ў тым, што электрамабілі да гэтага часу застаюцца недаступнымі не толькі для большасці беларусаў, але і для многіх кіроўцаў у свеце, паколькі цэны вельмі высокія. Так, ёсць варыянты ад іншых кампаній — напрыклад Ford і Nissan — і кошты даволі сярэднія, але ў іх ёсць вялікая праблема — ёмістасць акумулятараў дазваляе праязджаць 100—150 кіламетраў максімум. Гэта значыць, каб даехаць з Мінска ў Брэст, трэба зарадзіць аўто тры разы — каму і навошта гэта трэба?

Што да трывожных навін пра Tesla, то іх некалькі. Першая — агенцтва Reuters паведаміла, што 90% аўто кампаніі выпускаюцца з дэфектамі, хоць у кампаніі гэта адмаўляюць. Другая — рэкордныя страты кампаніі за трэці квартал 2017-га — амаль 620 мільёнаў долараў, паведамляе Wall Street Journal. Трэцяя — зборка новага бюджэтнага аўтамабіля Model 3 значна адстае ад графіка, што дэманструе нестабільную бізнес-мадэль.



І фінальная дэталь. Замест таго каб вырашыць цяперашнія праблемы, Tesla паказала два новыя аўтамабілі — электрацягач і родстар. Калі кампанія здолее выбрацца з гэтай сітуацыі, то 2018 год зможа стаць прарыўным для ўсёй галіны, паколькі трэнд зададзены менавіта яна. Але падзе Tesla — можа спыніцца і галіна.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. №401/С-31767 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – детский сад), площадью 1610,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Первомайская, 27 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 422050400001000128 (назначение – для обслуживания здания детского сада), площадью 0,5434, расположенный по адресу: г. Скидель, ул. Первомайская, 27. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью 0,0802 га |
| Начальная цена продажи | 18 226,18 руб. (восемнадцать тысяч двести двадцать шесть рублей восемнадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 911 руб. (девятьсот одиннадцать рублей) |
| Условия аукциона | Реконструкция и модернизация объекта |
| Продавец | ОАО «Скидельский сахарный комбинат», 231752, г. Скидель, ул. Первомайская, 1, 977-814 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | 100% предварительная оплата |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 27 декабря 2017 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 16.09.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 21 декабря 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

## Уведомление

Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоит ся 3 января 2018 года в 10.00 со следующей повесткой дня:

1. Принятие решения о крупной сделке. Подписание кредитного договора ОАО «Универсам Рига» с ОАО «Франсабанк».

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 50.

Регистрация участников собрания будет проводиться в день собрания с 9.50 до 10.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100299678

## Пад суд за хабар супрацоўніку ДАІ

**На аўтадарозе Гомель — Урыцкае супрацоўнікі ДПС ДАІ спынілі аўтамабіль «Фольксваген», якім кіраваў 47-гадовы жыхар Гомельскага раёна. У яго адсутнічаў дакумент, які пацвярджае праходжанне дзяржаўнага тэхагляду.**

Аказалася, за аналагічнае парушэнне кіроўца ўжо прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці. Таму, каб не патрапіць у рады «паўторнікаў» і пазбегнуць буйнога штрафу, ён прапанаваў міліцыянеру грошы. Афіцэр ДАІ адмовіўся, папярэдзіўшы аб супрацьзаконнасці такіх дзеянняў. Тым не менш мужчына паклаў некалькі купюр паміж сядзеннямі, што было зафіксавана відэарэгістратарам. На месца здарэння была выклікана следча-аператыўная група, якая задакументавала злачынства. Падазраванага затрымалі, заведзена крымінальная справа, мужчына можа быць пакараны пазбаўленнем волі да пяці гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Здарэнні

# ЗГОН З ДАСТАЎКАЙ

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама і Ленінскага РУУС сталіцы затрымалі 23-гадовага ўраджэнца Гомельскай вобласці, які падазраецца ў здзяйсненні чатырох крадзяжоў аўтамабіляў на тэрыторыі Ленінскага раёна.**

Малады чалавек пражываў у мікрараёне Серабранка ў прыватным доме, працаваў у службе дастаўкі. У ліку ўкрадзеных ім аўтамабіляў Mercedes-Benz 250, два Volkswagen Jetta, Ford Sierra. Машыны ён выкрадаў з парковак каля жылых дамоў. Дзве прадаў, а з дзвюх другіх браў запчасткі для ўласнага аўтамабіля. Апошні факт згону быў у канцы лістапада, а пачаў свае злачынную дзейнасць хлопец увесну. Аператыўнікам малады чалавек прызнаўся ў 11 крадзяжах з аўтамабіляў — акумулятараў, запчастак, камплектуючых. Заведзена крымінальная справа, зламысніку можа пагражаць да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*